БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3’06-3-93

**ПЯТРОЎСКАЯ**
ТАЦЦЯНА МІХАЙЛАЎНА

# БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ПРОЗА ПАЧАТКУ XXI СТ.: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2022

Работа выканана ва ўстанове адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

**Навуковы кіраўнік** — **Штэйнер Іван Фёдаравіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

**Афіцыйныя апаненты:** — **Тычко Галіна Казіміраўна,** доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Сенькавец Уладзімір Адамавіч,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай філалогіі УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”

**Апаніруючая арганізацыя** — УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Абарона адбудзецца 30 верасня 2022 года а 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, аўд. 62; тэлефон вучонага сакратара: +375 378-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Аўтарэферат разасланы “29” жніўня 2022 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацыі М. М. Хмяльніцкі

# УВОДЗІНЫ

Дзіцячая літаратура ўпершыню знаёміць чалавека з мастацкім словам, вучыць успрымаць тыя нормы і ўяўленні, якія пануюць у грамадстве. Слова, выражанае ў мастацкай форме і адрасаванае дзецям, развівае эстэтычны густ, спрыяе выхаванню align рознабаковай асобы, прапаноўвае чытачу новыя факты пра жыццё і свет, з'яўляецца своеасаблівым культурным сродкам сувязі з дарослым. Спалучэнне мастацкага і дыдактычнага ў дзіцячай літаратуры абумоўлівае яе шматпланавасць, сувязь з педагогікай і псіхалогіяй. Кнігі, напісаныя спецыяльна для дзяцей, з'явіліся ў пэўны гістарычны перыяд, у эпоху Асветніцтва, і былі важным сродкам педагагічнага ўздзеяння і каналам трансляцыі культуры таго часу. Кожная эпоха прапаноўвала ўласныя падыходы да вызначэння зместу дзіцячай літаратуры, яе тэматыкі і функцый. У гэтым сэнсе сучасная дзіцячая літаратура адлюстроўвае змены ў сістэме каштоўнасцей у парадыгме выхавання дзяцей і адукацыі, дзіцячай субкультуры ў постсавецкі перыяд. Разам са зместам дзіцячай літаратуры мяняецца і азначэнне гэтага паняцця. Пэўны час прыналежнасць кнігі да дзіцячай літаратуры вызначалася самім аўтарам, што было даволі суб'ектыўным параметрам, бо ў змест дзіцячага чытання часта ўводзіліся кнігі, якія не прызначаліся для дзяцей. Менавіта таму ў аб'ём паняцця дзіцячай літаратуры ўключалі таксама творы, якія былі напісаны для дарослых і атрымалі папулярнасць сярод дзяцей. Такім чынам, дзіцячая літаратура – гэта мастацкая творчасць, адрасаваная дзецям ці адаптаваная пад дзіцячы ўзрост, якая арыентуецца на інтарэсы дзяцей і мае дыдактычную вартасць.

Да дадзенай тэмы ў беларускім літаратуразнаўстве звярталася адносна невялікая колькасць даследчыкаў. З сучасных прац можна вылучыць дысертацыі В. Жыбуль, А. Жышкевіч, В. Несцяровіч, А. Трафімчыка, С. Харытонавай, у савецкі час даследаваннем дзіцячай літаратуры займаліся Л. Храпунова, Э. Гурэвіч, Н. Кавалёў, В. Бігеза, Р. Літвінаў. Пры тэарэтычным даследаванні беларускай дзіцячай літаратуры мы абапіраліся на крыніцы трох тыпаў: даследаванні айчынных і расійскіх вучоных, прысвечаныя псіхолага-педагагічнаму аспекту дзіцячага чытання мастацкіх твораў у розных узроставых катэгорыях (Д. Зылевіч, С. Карайчанцава, Н. Малахава, В. Праскаловіч, І. Харламаў); работы, у якіх адлюстраваны асноўныя кірункі развіцця дзіцячай літаратуры, даследуецца творчасць пісьменнікаў ці вызначаюцца асаблівасці пэўных жанраў (І. Арзамасцава, Т. Борбат, Ф. Драбеня, М. Ляшук, А. Макарэвіч, І. Мінералава, А. Трафімчык, М. Яфімава); даследаванні па праблемах сучаснай дзіцячай літаратуры (Л. Алейнік, А. Грушэцкі, А. Гурэвіч, М. Шаўлоўская).

**Актуальнасць** дысертацыі абумоўлена: неабходнасцю комплекснага, сістэмнага даследавання феномена дзіцячай літаратуры ў міждысцыплінарным дыскурсе, вызначэння яе адпаведнасці ці неадпаведнасці сённяшнім гуманістычным каштоўнасцям, а таксама патрэбам сучаснага дзіцяці ў духоўным і маральным засваенні актуалій рэчаіснасці. Сучасныя сацыяльныя патрабаванні да адукацыі накіраваны на развіццё духоўна-маральнай асобы, яе інтэграцыі ў нацыянальную культуру, што вызначае пошук шляхоў рэалізацыі выхаваўчых магчымасцей літаратуры. У сувязі з тым, што ў эпоху інфармацыйных тэхналогій кніга губляе свае вядучыя пазіцыі як носьбіт культурных кодаў, актуальным з’яўляецца выяўленне тых фактараў, якія ўплываюць на чытацкія інтарэсы дзяцей. Сучасныя даследаванні пра дзіцячую літаратуру з’яўляюцца міждысцыплінарнымі, таму актуальнай з’яўляецца выпрацоўка агульных крытэрыяў для класіфікацыі кніг у адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі дзяцей, што, у сваю чаргу, патрабуе абнаўлення даследаванняў псіхалагічных асаблівасцей успрымання кнігі дзецьмі кожнай узроставай катэгорыі, асэнсавання ўплыву тэндэнцый развіцця дарослай літаратуры на дзіцячую, вылучэння новых спецыфічных літаратурных прыёмаў, сродкаў і жанрава-тэматычнай сістэмы сучаснай прозы для дзяцей.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.**

Работа выканана на кафедры беларускай літаратуры установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”. Дысертацыйнае даследаванне выканана адпаведна заданню “Гістарыясофская і этыка-антрапалагічная праблематыка беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзяў” (№ дзяржрэгістрацыі 20161022) падпраграмы “Беларуская мова і літаратура” дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” за 2016 год.

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – выяўленне асаблівасцей беларускай дзіцячай прозы на сучасным этапе яе развіцця шляхам сістэмна-комплекснага аналізу твораў і попыту адпаведнай чытацкай аўдыторыі.

Мэта можа быць дасягнута пры вырашэнні наступных **задач:**

1. Вызначыць аб’ём паняцця “дзіцячая літаратура”, яго спецыфіку ў адпаведнасці з сучаснымі навуковымі канцэпцыямі.

2. Выявіць адпаведнасць асаблівасцей успрымання мастацкага тэксту ў дашкольным узросце і жанрава-тэматычнай разнастайнасці твораў, прапанаваных для дашкольнікаў.

3. Даследаваць тэматыку і характары персанажаў у творах, рэкамендаваных для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

4. На аснове аналізу сучасных казак вызначыць асаблівасці іх зместу і формы.

5. Выявіць аб'ём паняцця "падлеткавая літаратура", жанрава-тэматычныя асаблівасці дадзенай катэгорыі літаратуры, адметнасці вобразаў герояў-падлеткаў.

**Аб'ект даследавання**: празаічныя творы айчынных прадстаўнікоў дзіцячай і падлеткавай літаратуры, створаныя ў пачатку XXI стагоддзя, прызначаныя для дашкольнага, малодшага і сярэдняга школьнага ўзростаў (А. Масла, В. Гапееў, А. Бадак, А. Карлюкевіч, Л. Рублеўская, Р. Баравікова, К. Хадасевіч-Лісавая, Г. Скаржынская-Савіцкая).

**Прадмет даследавання**: тэндэнцыі развіцця сучаснай дзіцячай літаратуры, жанрава-тэматычныя асаблівасці сучасных дзіцячых празаічных твораў, іх ідэйны змест, кампазіцыйныя варыяцыі.

**Навуковая навізна даследавання.**

У рабоце *ўпершыню* комплексна вызначаны вядучыя тэндэнцыі ў зменах ідэйна-эстэтычнага зместу празаічнага твора, адрасаванага дзецям; вылучаны наратыўныя і кагнітыўна-эмацыянальныя аспекты сюжэтаў і сістэм персанажаў у беларускай прозе 2001 – 2010-х гг. для дзяцей. Вызначаны судносіны рэалістычнага і фантастычнага пачаткаў, уласцівых сучаснай дзіцячай літаратуры, раскрыта і сцверджана спецыфіка псіхалагічнага аналізу ў ёй. Вызначаны жанравыя адметнасці твораў 2001 – 2010-х гг. для чытацкай аўдыторыі розных узроставых катэгорый (літаратура для дашкольнікаў, літаратура для школьнікаў малодшага школьнага ўзросту, літаратура для школьнікаў старэйшага школьнага ўзросту), экспансія жанру літаратурнай казкі. Створана цэласная характарыстыка тых ідэйна-эстэтычных праяў у беларускай прозе для дзяцей, што абумоўлены тэндэнцыяй да змены выхаваўчай парадыгмы ў грамадстве. Праведзена арыгінальнае сацыялагічнае даследаванне чытацкіх інтарэсаў дзяцей і падлеткаў у выбары кніг, прыярытэтаў бацькоў дашкольнікаў, адпаведнасці інтарэсаў чытацкай аўдыторыі і новай літаратуры для дзяцей, створанай у Рэспубліцы Беларусь.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Дзіцячая літаратура характарызуецца выразнай спецыфічнасцю, бо знаходзіцца на мяжы ўласна літаратуры і педагогікі, літаратуры і псіхалогіі. Прапорцыя забаўляльнага і выхаваўчага элементаў у такой літаратуры абумоўлена наяўнасцю дзвюх катэгорый чытачоў: свядомага дарослага і наіўнага дзіцяці. Дваісты статус дзіцячай літаратуры абумоўлівае з'яўленне розных відаў яе крытыкі (аналіз мастацкасці твора і аналіз яго педагагічнай

цэласнасці), класіфікацый (згодна з жанравымі асаблівасцямі твораў і згодна з узроставымі магчымасцямі чытача).

2. На запыты сучаснага пакалення дзяцей уплывае схільнасць да кліпавага мыслення. Яна фарміруецца ў сувязі з экспансіяй масавай культуры, што актыўна распаўсюджваецца ва ўсім свеце з сярэдзіны ХХ ст. Развіццю такога хуткага, але неглыбокага мыслення спрыяюць таксама і жанравыя адметнасці твораў для дашкольнага ўзросту, у якіх улічана псіхалогія ўспрымання мастацкага тэксту дзецьмі. У сучасных кнігах для дашкольнікаў шырока прадстаўлены займальныя ілюстрацыйна-інтэрактыўныя і тэкставыя элементы: пазлы, маляванкі, матэрыял для аплікацыі, рэцэпты, песні. Аўтары сучаснай беларускай прозы для дзяцей імкнуцца выкарыстоўваць названыя элементы не толькі для стымуляцыі хуткасці і яскравай вобразнасці дзіцячага мыслення, але ў першую чаргу для забеспячэння развіццёвай работы над спасціжэннем ідэі твора, расстаноўкі акцэнтаў на эпізодах, якія маюць выхаваўча-пазнавальнае значэнне.

3. У цэнтры большасці кніг для малодшых школьнікаў – асоба дзіцяці, прызнанне яе індывідуальнасці. Разам з тым аўтары імкнуцца пазбягаць гвалту, нязручных для дзіцячых кніг тэм. З аднаго боку, гэта з’яўляецца праявай сучаснай тэндэнцыі імкнення максімальна ахоўваць дзіця. З другога боку, гэта паказальнік пэўнага разрыву паміж зместам кнігі і той інфармацыяй, якую атрымліваюць дзеці з іншых крыніц. Па жанравых і тэматычных асаблівасцях вылучаюцца наступныя катэгорыі кніг для малодшых школьнікаў: апавяданні, дзе галоўнымі героямі з’яўляюцца дзеці; казкі пазнавальнага характару; казкі-падарожжы з героямі-равеснікамі. Персанажы робяць вывады самастойна, не губляюцца ў экстрэмальных сітуацыях, вырашаюць уласныя праблемы.

4. Сучасная беларуская літаратурная казка генетычна суадносіцца з такімі літаратурнымі жанрамі, як фальклорная казка і фэнтэзі. Аднак мае шэраг асаблівасцей, сярод якіх можна вылучыць наступныя: зварот да праблем сям’і, у прыватнасці, да амаль забароненай раней тэмы – разводу бацькоў; вызначаецца ўплыў камп’ютарызацыі; казка становіцца сродкам выяўлення этнакультурнай ідэнтычнасці дзіцяці; змяняюцца (асучасніваюцца) вобразы-персанажы і вобразы-рэчы галоўных дзеючых суб’ектаў.

5. Сучасны твор для падлеткаў – гэта частка дзіцячай літаратуры, для якой характэрны тэндэнцыі росту праблемнасці ў характарах персанажаў, зварот да адносін з прадстаўніком супрацьлеглага полу, наяўнасць атрыбутыкі сучаснага падлеткавага жыцця, мінімізацыя дэкларатыўнай ацэначнасці і павучальнасці, увага да перажыванняў галоўнага героя і яго адносін са светам, часта канфліктных. Узрост героя і вызначае ўзрост чытацкай аўдыторыі кніг. У сучасных падлеткавых творах мяняецца вобраз значнага дарослага, ён

становіцца больш інфантыльным, засяроджаным на сваіх пачуццях, што адпаведна прыводзіць да пэўнай аўтаномнасці героя-падлетка.

**Асабісты ўклад дысертанта**

Дысертацыя з’яўляецца самастойным даследаваннем, выкананым на аснове аналізу навуковай і мастацкай літаратуры. Аўтару належаць усе тэарэтычныя і практычныя высновы, прадстаўленыя ў дысертацыі і ў апублікаваных працах. У дысертацыі ўпершыню даследаваны асаблівасці твораў для дзяцей не толькі пры дапамозе літаратуразнаўчага аналізу, але і шляхам вывучэння псіхалогіі ўспрымання твораў дзецьмі, вывучэння сацыялогіі чытання і сучаснай дзіцячай субкультуры.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.**

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання прайшлі апрабацыю на семінарах кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”, а таксама на наступных канферэнцыях: 1. Міжнародныя навуковыя чытанні “Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах” (Гомель, 25–26 верасня 2014 г.); 2. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры”, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі (Мінск, 26–27 лютага 2015 г.); 3. XXII Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Ад ідэі – да інавацыі” (Мазыр, 23–24 красавіка 2015 г.); 4. IX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Дзіцячы сад – пачатковая школа: вопыт, праблемы пераемнасці і аптымізацыі адукацыі” (Мазыр, 25 кастрычніка 2015 г.); 5. Юбілейная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 85-годдзю Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны” (Гомель, 17 чэрвеня 2015 г.); 6. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Актуальныя пытанні бесперапыннай педагагічнай адукацыі” (Гомель, 10–11 сакавіка 2016 г.); 7. Міжнародныя навуковыя чытанні “Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах”, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі, акадэміка Івана Навуменкі (Гомель, 6–7 кастрычніка 2016 г.); 8. II Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя з міжнародным удзелам “Актуальныя праблемы філалагічных і педагагічных навук”, прысвечаная даследаванням у галіне лінгвістыкі, літаратуразнаўства (Баранавічы, 23 лістапада 2016 г.); 9. Рэспубліканская навуковая канферэнцыя Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (Брэст, 25 лютага 2016 г.); 10. XIII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў “Садружнасць навук. Баранавічы – 2017” (Баранавічы, 23 лістапада 2017 г.); 11. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя

“Гісторыя беларускай літаратуры: стан і перспектывы даследавання” (да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа) (Мінск, 15–16 лістапада 2017 г.); 12. V Міжнародныя Шамякінскія чытанні “Пісьменнік – Асоба – Час” (Мазыр, 29 верасня 2017 г.); 13. Куляшоўскія чытанні: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (Магілёў, 19 красавіка 2018 г.); 14. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: практико-ориентированная и фундаментальная подготовка на первой и второй ступенях высшего образования” (Гомель, 15–16 сакавіка 2018 г.); 15. II Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі” (Мінск, 15–16 лістапада 2018 г.); 16. IV Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Актуальные проблемы филологических и педагогических наук” (Баранавічы, 21 лістапада 2018 г.); 17. Міжнародная навуковая студэнцкая канферэнцыя “Христианские ценности в культуре современной молодежи” (Мінск, 26 кастрычніка 2018 г.); 18. VI Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі “Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах” (Гомель, 2–3 кастрычніка 2018 г.); 19. V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Global science and innovations 2019 : Central Asia», (Астана, 17 сакавіка 2018 г.); 20. Куляшоўскія чытанні: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (Магілёў, 19 красавіка 2019 г.); 21. Юбілейныя XXV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні “Спадчына святых Кірыла і Мяфодзія ў сусветнай духоўнай культуры” (Мінск, 31 мая 2019 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 36 публікацыях, сярод якіх 8 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (3,3 аўт. арк.), 7 артыкулаў ў навуковых зборніках і часопісах (2 аўт. арк.), 21 матэрыялаў навуковых канферэнцый (6,3 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 11,6 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі** абумоўлены мэтай і задачамі даследавання. Праца складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння і бібліяграфічнага спіса, які налічвае 218 найменняў прац айчынных і замежных аўтараў. Асноўны тэкст займае 120 старонак, бібліяграфічны спіс – 17 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першым раздзеле **“Жанрава-тэматычныя асаблівасці літаратуры для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзростаў”** выкладзены тэарэтычныя аспекты паняцця “дзіцячая літаратура” і яе класіфікацыя. Таксама прааналізавана проза для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзростаў і праведзена яе жанрава-тэматычная сістэматызацыя. Аналізуецца змест напрацовак даследчыкаў адносна статусу сучаснай дзіцячай літаратуры, а менавіта кнігі і артыкулы І. Арзамасцавай, І. Мінералавай, М. Пятроўскага, А. Нікіфарава, Л. Браўдэ, Л. Аўчыннікавай, А. Зварыгінай, С. Лойтэр, А. Прывалавай і іншых.

Першы раздзел складаецца з трох падраздзелаў. У падраздзеле 1.1 “**Сучасныя аспекты даследавання дзіцячай літаратуры”** зроблены аналіз розных падыходаў да вызначэння спецыфічнасці дзіцячай літаратуры. Спецыфіка дзіцячай літаратуры абумоўлена ўплывам на яе спалучэння трох фактараў: педагагічнага, грамадскага і ўласна літаратурнага (Х. Эверс); узнікненем на фоне ўжо сталай дарослай літаратуры і дамінуючага развіцця эпаса (М. Нікалаева); максімальнай дэмакратычнасцю (М. Пятроўскі); блізкасцю да масавай літаратуры па прычыне аптымістычнага і забаўляльнага характару (Ю. Лотман); дыдактызмам (І. Арзамасцава). Сучасныя канцэпцыі даследавання дзіцячай літаратуры ўключаюць у сябе як класічны літаратурны аналіз твораў, так і псіхалагічную экспертызу, сацыялагічнае даследаванне, вызначэнне асаблівасцей сучаснай дзіцячай субкультуры. Аналіз сучаснай айчыннай крытыкі дзіцячай літаратуры дазваляе вылучыць наступныя яе віды: рэкамендацыйная (артыкулы-рэцэнзіі і аглядавыя артыкулы з пералікам і ацэнкай сучасных твораў), праблемная (артыкулы дыскусійнага характару) і эстэтычная (артыкулы, у якіх разглядаюцца мастацкія вартасці твораў).

У падраздзеле таксама разглядаецца пытанне тыпалогіі дзіцячай літаратуры: функцыянальная і ўзроставая класіфікацыі, падзел па жанрах. У аснове класіфікацый па функцыях закладзены параметр прапорцыі пазнавальнасці і мастацкасці твора, што з’яўляецца даволі суб’ектыўным крытэрыем для характарыстыкі твора. Узроставая класіфікацыя дэманструе адпаведнасць зместу твора яго чытацкай аўдыторыі. Жанравая спецыфіка твораў для кожнай узроставай катэгорыі варыятыўная, што звязана з розным узроўнем успрымання мастацкага твора ў пэўным узросце.

У падраздзеле 1.2 **“Асаблівасці літаратуры для дашкольнага ўзросту”** аўтар прыводзіць вынікі анкетавання на тэму сучасных чытацкіх прыярытэтаў дашкольнікаў. З улікам меркаванняў псіхолагаў і бацькоў для дашкольнай мастацкай літаратуры можна вылучыць наступныя характарыстыкі:

кансерватыўны характар літаратуры, недапушчальнасць трансгрэсіўных эксперыментаў і навацый, максімальная ілюстраванасць кнігі, гарманічнае спалучэнне зместу і афармлення кнігі, адназначная эмацыянальная афарбоўка персанажаў і сюжэтных перыпетый твора, выразны сюжэт. Разам з тым, нельга не ўлічваць змены ва ўспрыманні кніг сучаснымі дашкольнікамі. Па-першае, у цяперашні час назіраецца значнае зніжэнне ўзроставых межаў уключэння дзіцяці ў кантэкст дзіцячай субкультуры, што выражаецца ў чытанні дашкольнікамі кніг, якія раней чыталі ў школьным узросце. Гэта звязана з больш хуткімі тэмпамі пазнавальнага развіцця дзяцей, бо крыніц інфармацыі (тэлебачанне, інтэрнэт) становіцца больш. Аднак часта маленькі чытач гатовы ўспрымаць сюжэт твора, дзеянні герояў, але не здольны да сапраўднага спачування герою. У выніку фарміруецца пасіўны чытач, не здольны да аналізу кнігі, які ўспрымае яе толькі як спажывец. Па-другое, візуальны кампанент выдання становіцца галоўным параметрам пры выбары кніг. Максімальная ілюстраванасць кніг, перавага пазнавальных сюжэтаў над выхаваўчымі з'яўляюцца вынікам змены ўмоў, у якіх выхоўваецца сучасны дашкольнік. Псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання мастацкага тэксту дашкольнікамі паўплывалі на жанравыя асаблівасці кніг для адпаведнага ўзросту. Узмоцнены невербальны кампанент прадстаўляе сабой характэрную рысу *кніг-карцінак (У. Бубен, В. Богдан)*. Спалучэнне гульні і сацыялізацыі характэрна для *казак пазнавальнага характару з гульнёвым элементам (В. Астахновіч, Т. Сівец, Г. Скаржынская-Савіцкая)*. Наяўнасць антрапаморфнага персанажа і сюжэту, звязанага з вобразам дома, вылучаецца ў *казках-прыгодах жывёлы ці адушаўлёнага прадмета (Н. Бучынская, Г. Скаржынская-Савіцкая, В. Богдан, Л. Рублеўская)*.

У падраздзеле 1.3 **"Асаблівасці літаратуры для малодшага школьнага ўзросту"** таксама прыводзяцца вынікі анкетавання і асаблівасці псіхалагічнага ўспрымання мастацкіх твораў дзецьмі малодшага школьнага ўзросту. Супастаўленне адказаў дарослых і дзяцей на пытанні адносна чытацкіх прыярытэтаў малодшых школьнікаў паказвае, што дарослыя недаацэньваюць чытацкія магчымасці дзяцей, прапаноўваюць ім кнігі, якія па сюжэце, сістэме персанажаў разлічаныя на дашкольнікаў.

Па жанравых і тэматычных асаблівасцях вылучаюцца наступныя катэгорыі кніг для малодшых школьнікаў: *апавяданні, дзе галоўны герой – дзіця; казкі пазнавальнага характару, казкі-падарожжы з героямі-равеснікамі.*

Нягледзячы на лідзіруючыя пазіцыі казкі, паралельна з неверагоднымі сюжэтамі аўтары прапаноўваюць і *падзеі, набліжаныя да рэальнасці (Т. Мушынская, А. Зэкаў, В. Ткачоў, В. Гурскі)*. Гэта абумоўлена і новымі педагагічнымі задачамі літаратуры для дадзенага ўзросту: школьнік мае

магчымасць убачыць у кнізе свайго рэальнага аднагодку, які жыве ў тыповых для яго абставінах. Апавяданні адрозніваюцца ад казачных сюжэтаў узмоцненым псіхолага-эмацыянальным аспектам. Аўтараў цікавяць эмоцыі дзіцяці, яго перажыванні, звязаныя ці з новым жыццёвым вопытам, ці з атрыманнем новай інфармацыі. Безумоўна, аўтары стараюцца выкарыстоўваць прыёмы для прыцягнення цікавасці дзіцяці, якое ў чытанні падобнай літаратуры робіць першыя крокі. Адзін з такіх прыёмаў – інтрыгуючая назва, якая часта абяцае менавіта казачны, неверагодны сюжэт. Яшчэ адна пазнака рэалістычнага апавядання для дзяцей – выкарыстанне апісання прыроды, якое дзеці малодшага школьнага ўзросту ўжо гатовыя ўспрымаць, а таксама своеасаблівы забаўляльны элемент, які выяўляецца ці праз гумар, ці праз элементы казачнага. *Казкі з пазнавальным сюжэтам (Л. Рублеўская, Р. Баравікова, А. Бутэвіч, А. Марціновіч, В. Шчукіна)* набываюць папулярнасць з пачаткам навучання ў школе. Такія творы ў казачнай форме паведамляюць пра асаблівасці тых ці іншых з'яў, прадметаў. Вельмі падобнымі па сваіх пазнавальных задачах у гэтым сэнсе з'яўляюцца кнігі *Р. Баравіковай "Казкі з гербарыя"* і *Л. Рублеўскай "Карона на дне віра, альбо Казкі з хутара Юстына"*. Абедзве кнігі апавядаюць у казачнай форме пра гісторыю паходжання тых ці іншых раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, па жанравых асаблівасцях балансуюць паміж казкай і баладай, бо ў арсенале абедзвюх пісьменніц ёсць як гісторыі перамогі дабра над злом, так і адваротныя. Не характэрная для казак нешчаслівая канцоўка тут абумоўлена пазнавальнымі задачамі: незвычайным спосабам "ажывіць" тую ці іншую расліну, тым самым выхоўваючы да яе беражлівае стаўленне.

Калі ў дашкольным узросце героямі казак становяцца жывёлы ці адушаўлёныя прадметы, то ў малодшым школьным узросце дзяцей цікавяць равеснікі, якія дзейнічаюць у нетыповых умовах, таму папулярнымі становяцца *казкі-падарожжы з героямі-равеснікамі (В. Гапееў, А. Масла, У. Васькоў, В. Гурскі, А. Карлюкевіч)*. Трэба адзначыць, што пад катэгорыю равеснікаў трапляюць і анімалістычныя персанажы (часцей – звяры і птушкі Беларусі), якія дзейнічаюць падобна да дзяцей адзначанага ўзросту, і дарослыя, паводзіны якіх вызначаюцца пэўнай дзіцячай наіўнасцю. Калі ў творах для дашкольнікаў героі карэкціруюць свае паводзіны згодна з рэкамендацыямі старэйшых, то ў творах дадзенай узроставай катэгорыі персанажы робяць вывады самастойна, не губляюцца ў экстрэмальных сітуацыях, спраўляюцца з уласнымі праблемамі. Дарослыя мінімальна ўдзельнічаюць у справах дзяцей. У творы *"Дахавік Казік" У. Васькова* героем з'яўляецца дарослы, які дзейнічае і як дарослы, і як дзіця. З аднаго боку, ён сам зарабляе сабе грошы на жыццё, жыве асобна, аднак пры

гэтым любіць глядзець мультфільмы, адчувае выключна платанічныя адносіны да супрацьлеглага полу, па-дзіцячы захапляецца морам.

У творах для малодшых школьнікаў мяняецца і наратыўная стратэгія. Аўтарскія казкі для дашкольнікаў больш набліжаны да народных, таму ў іх часцей за ўсё пануе безасабовы наратыў. Аўтары твораў для малодшых школьнікаў імкнуцца стварыць своеасаблівы дыялог з чытачом, таму наратыўная стратэгія такіх твораў адрозніваецца ад стратэгій народных казак. Так, напрыклад, у казачнай аповесці *А. Масла “Вандроўка з божымі кароўкамі”* апавядальнік спрабуе размаўляць з дзецьмі, задаваць ім пытанні, звяртацца да чытачоў. Кнігу А. Масла можна падзяліць умоўна на дзве часткі. Аб’ектыўны апавядальнік у першай частцы – эмацыянальны, у другой – нейтральны. Нягледзячы на незвычайнасць божых каровак, дзеянні ў першай частцы адбываюцца не ў казачнай рэальнасці, а ў рэальным горадзе. У другой частцы кнігі завязваецца асноўны канфлікт паміж станоўчымі і адмоўнымі персанажамі, сюжэт становіцца больш дынамічным, у якасці асноўнага героя выступае ўжо герой-равеснік (Данік), з’яўляецца своеасаблівая казачная рэальнасць, наратыў мяняецца на стылістычна нейтральны, больш падобны да наратыву народных казак.

У другім раздзеле **“Жанрава-тэматычная спецыфіка сучаснай літаратурнай казкі”** разглядаюцца жанравыя асаблівасці сучаснай казкі, уплыў дзіцячай субкультуры на яе змест. У сваім даследаванні мы абапіраліся на меркаванні такіх беларускіх і замежных літаратуразнаўцаў і мастацтвазнаўцаў, як А. Бязлепкіна, П. Васючэнка, А. Нікіфараў, Л. Браўдэ, А. Зварыгіна, А. Фліер, С. Лойтэр, А. Ільінава, А. Коўтун, Я. Няелаў.

У падраздзеле 2.1 “**Традыцыі і навацыі ў сучаснай літаратурнай казцы”** разглядаецца спецыфіка літаратурнай казкі ў параўнанні з іншымі жанрамі. Сучасная літаратурная казка мае падобныя рысы з такімі жанрамі, як фэнтэзі і народная казка. Народная і літаратурная казкі маюць шэраг адрозненняў па наступных параметрах: метад адлюстравання рэчаіснасці, хранатоп, памеры, выхаваўча-педагагічная ідэя, форма наратыву, інтэртэкстуальныя сувязі.

Прапорцыя аўтарскай індывідуальнасці і фальклорнай традыцыі вызначае арыгінальнасць літаратурнай казкі. Сярод адметнасцей сучаснай казкі можна вылучыць:

1) *Зварот да праблем сям’і.* У апошні час пашырылася тэндэнцыя да стварэння казачных аповесцей, якія могуць уключаць у сябе шмат частак. Дзякуючы гэтаму ў аўтараў з’явілася магчымасць надаць значна больш увагі сацыялізацыі свайго героя, выбудаваць больш выразную і разгалінаваную сістэму персанажаў. Дзеці-героі сталі хутка “абрастаць” сваякамі. Асноўная

прычына “адсутнасці” ў галоўнага героя дзіцячых кніг бацькоў – іх непатрэбнасць, бескарыснасць. У гэтым сэнсе паказальнымі з’яўляюцца творы *Т. Сівец “Самы лепшы падарунак”* і *А. Масла “Пакінутае дзіця”, “На Каляды да хроснай”*. Кніга пра развод, смерць ці тайну нараджэння дзіцяці скіравана не на тое, каб парушыць далікатны свет дзяцінства, а каб з дзяцінства прывіць правільныя адносіны да гэтых з’яў і выпрацаваць алгарытм паводзін у адзначаных сітуацыях. У сучасных літаратурных казках часцей за ўсё паказана сям’я, у якой бацькам не хапае часу на дзяцей. Прабел у выхаванні запаўняюць бабулі. Так, напрыклад, у творы *Т. Сівец “Самы лепшы падарунак”* адзіным дарослым у творы выступае бабуля, прычым ва ўмовах канфлікту паміж бацькамі гэта дапамагае персанажу-дзяўчыне. У творы *У. Ліпскага “Прыгоды Нуліка”* бабуля адрозніваецца яшчэ і фантазіяй, прыдумляе для ўнука розныя гульні. Як правіла, у вобразе бабулі спалучаюцца мацярынская клапатлівасць і бацькоўская мудрасць. У творы *Т. Сівец “На Каляды да хроснай”* галоўным дарослым выступае хросная, якая якраз і выконвае ролю бабулі, аднак па прычыне ўзросту адрозніваецца меншай кансерватыўнасцю. Сюжэтаўтваральнымі з’яўляюцца суадносіны вобразаў маці і бацькі. Нярэдка яны стэрэатыпныя. Асноўны клопат маці – жыццядзейнасць і здароўе дзіцяці. Так, маці ў творы *Г. Аўласенкі “Вася Лайдачкін”* – тыповая выхавацельніца, крыху істэрычная, крыху пяшчотная, аднак у цэлым – вобраз, які не аказвае ніякага ўплыву на дзіця. Іншая роля адведзена бацьку, аўтарытэт якога будуецца менавіта на шырокім кругаглядзе, мудрасці, дэмакратызме, у той час як маці характарызуецца аўтарытарнымі адносінамі да выхавання. Так, напрыклад, у *“Прыгодах Нуліка” У. Ліпскага* менавіта тата дапамагае сыну вырашаць матэматычныя задачы. Разам з тым стэрэатып можа парушацца: напрыклад, у творы *Л. Рублеўскай “Прыгоды Мышкі Пік-Пік”* бачым крыху інфантыльнага тату, які часта трапляе ў недарэчныя сітуацыі.

*2) Уплыў камп’ютарызацыі.*

Умоўна казкі, у якіх прысутнічае камп’ютар ці падобны гаджэт, можна падзяліць на некалькі катэгорый.

<u>Казкі, у якіх камп’ютар адлюстраваны як рэальны атрыбут сучаснага жыцця.</u> У такіх творах гаджэты не надзелены ніякімі фантастычнымі звышздольнасцямі. Некаторыя пісьменнікі *(А. Карлюкевіч, У. Ліпскі)* падтрымліваюць занепакоенасць псіхолагаў і педагогаў ростам адарванасці сучасных дзяцей ад рэальнасці. У такім выпадку сродкі тэхнічнага прагрэсу выконваюць ролю негатыўнай сілы, якая прыводзіць героя да няправільнага шляху. Так, напрыклад, у казцы *А. Карлюкевіча “Святланка піша сачыненне”* аўтар супрацьпастаўляе Інтэрнэту бібліятэку як верагодны сродак атрымання інфармацыі. У казцы *У. Ліпскага “Прыгоды Нуліка”* хлопчык, атрымаўшы ў

падарунак прыстаўку, забывае пра свайго сябра і ўвесь час бавіць за камп'ютарнымі гульнямі. Камп'ютар у такіх казках – неадушаўлёны прадмет, карысць якога вызначае яго карыстальнік.

Казкі, у якіх сучасныя гаджэты становяцца героямі ў своеасаблівай казачнай рэальнасці *(А. Бутэвіч, К. Хадасевіч-Лісавая)*. Казачная рэальнасць у такіх творах будуецца на аснове віртуальнага свету і яго атрыбутаў. Менавіта такое Іншае царства створана ў казцы *А. Бутэвіча "Прыгоды Віруса Шкодзі"*. Іншае царства казкі ці яе фантастычная прастора прадстаўлена каралеўствам Сусветнае Сеціва, дзе ўсе жывуць у згодзе адзін з адным. Фальклорнае і сучаснае часта перамяжоўваецца ў творы. Аўтар казкі пра Віруса Шкодзю павялічыў маштабы бессмяротнасці віруса, выкарыстоўваючы для гэтага як сродкі мастацкай умоўнасці ў вобразе галоўных казачных злодзеяў, так і значна большую прастору (тры працэсары схаваныя ў абсалютна розных месцах). Па-першае, такое перабольшанне адпавядае сутнасці камп'ютарнага віруса, які можа быць схаваны ў адвольным месцы, па-другое, становіцца своеасаблівай завязкай для сюжэту, бо наступныя падзеі звязаны з пошукамі смерці віруса. Трэба адзначыць, што казка перш за ўсё вылучаецца пазнавальным аспектам, бо дзеці знаёмяцца з сістэмай працы камп'ютара. У гэтым плане казка адрозніваецца адсутнасцю негатыву ў адносінах да тэхнічнага прагрэсу.

Казкі, дзе гаджэты выконваюць ролю адушаўлёных герояў, але пры гэтым сама казачная рэальнасць даволі абмежаваная (*А. Масла, Л. Ахроменка, А. Марціновіч, В. Шчукіна*). Чароўная краіна, створаная ў такіх казках, не з'яўляецца значнай. Напрыклад, у *"Казцы пра Мабілачку" Л. Ахроменка* галоўныя героі – мабільныя тэлефоны і планшэты, якія жывуць такім жа жыццём, як і звычайныя людзі. Менавіта паралелі паміж чалавечым жыццём і жыццём тэлефонаў прыцягваюць увагу чытача.

*3) Казка становіцца сродкам усведамлення этнакультурнай ідэнтычнасці дзіцяці*. Новай тэндэнцыяй у выхаванні этнакультурнай ідэнтычнасці ў сучасных казках з'яўляецца выкарыстанне ідэй у кантэксце хрысціянскага вучэння і экалагізацыі сучаснага патрыятычнага выхавання. Што датычыцца першага, то яно фарміруе як канвенцыйныя, маральныя, эталонныя каштоўнасці, так і прыватна-рэлігійныя. Так, святкуе каталіцкае Раство, наведвае святочную службу Казік з казачнай аповесці *"Дахавік Казік" У. Васькова*. Гераіня казкі *"На Каляды да хроснай" А. Масла* бачыць сапраўднага анёла, таксама святкуе Раство побач са сваёй хроснай.

*4) Мадэрнізацыя вобраза галоўнага героя*. Герой-дзіця ў сучасных літаратурных казках адрозніваецца ад герояў народнай і савецкай казак. У народных казках герой – часцей за ўсё чалавек у экстрэмальнай сітуацыі, які атрымлівае дапамогу ад чарадзейных сіл. Героі сучасных літаратурных казак

адрозніваюцца пэўнай самастойнасцю. Так, у аповесці *“Казкі сіняй падушкі” К. Хадасевіч-Лісавой* хлопчык Данік сам дапамагае вырашыць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у іншых герояў казкі. Прычым, калі Данік знаходзіцца не ў Чароўнай краіне, ён становіцца звычайным хлопчыкам, якому неабходна дапамога бацькоў. Гераіня казкі *А. Бадака “Краіна ведзьмаў”* нерашуча адносіцца да перспектывы апынуцца ноччу ў лесе, баіцца; аднак, трапляючы ў Краіну ведзьмаў, дзейнічае даволі смела, не спыняецца ні перад адной перашкодай. Калі прастора казкі адразу лакалізавана ў Краіне Чароўнага, героі праяўляюць самастойнасць. Галоўнае, што аб’ядноўвае герояў сучасных айчынных казак, – гэта імкненне дапамагчы, своеасаблівая міласэрнасць. Прычым яна характэрная не толькі для герояў-дзяцей, але і для вобразаў антрапаморфных жывёл, нават рэчаў.

*5) Суіснаванне чароўнага і рэалістычнага свету*. Іншасвет сучаснай літаратурнай казкі відавочна апелюе да створаных дзецьмі выдуманых краін. Аднак ідэальнае ў іх – не лепшае, не поспех і росквіт, а тая мадэль, якая зразумелая дзіцяці, у якой няма месца дарослай паўсядзённасці, а канфлікты дабра і зла – відавочныя і просталінейныя. Прычым звычайна Краіна Чароўнага – гэта не паралельна існуючы свет, гэта мікрасвет, які існуе ў рэальнай краіне, аднак доступ у яе магчымы толькі дзецям і пры пэўных умовах. Наяўнасць Краіны Цудоўнага робіць казку падобнай да фэнтэзі, у якім таксама паказана альтэрнатыўная карціна свету, населеная міфічнымі істотамі. Для таго, каб трапіць у Краіну Цудоўнага, неабходны пэўны праваднік: залатыя рыбкі (*У. Саковіч “Вандроўкі машыніста Міколкі”*), божыя кароўкі (*А. Масла “Вандроўка з божымі кароўкамі”*), чароўная падушка (*“Казкі сіняй падушкі” К. Хадасевіч-Лісавой*), Шкодныя Звычкі (*Г. Аўласенка “Вася Лайдачкін”*), ведзьма (*А. Бадак “У краіне ведзьмаў”*). Героі-дзеці ў такіх іншасветах дзейнічаюць як дарослыя: яны не баяцца праяўляць самастойнасць, ім прадстаўляецца права выбару. Відавочна, што з’яўленне такіх краін – гэта адыход ад будзённасці, рэальнасці, у якіх канфлікты дзеці не здольны вырашыць самастойна. Часам Краіна Цудоўнага ўвасоблена ў пэўным чарадзейным героі, які жыве ў рэальным свеце: Нулік (*У. Ліпскі “Прыгоды Нуліка”*), рапуха (*А. Масла “Як пані Чаротная ў Палангу лятала”*), Шубуршун (*А. Карлюкевіч “Прыгоды Шубуршуна”*).

У падраздзеле 2.2 **“Гуманістычная скіраванасць казак А. Масла”** разглядаюцца казкі А. Масла як спадчынніцы гуманістычнай казачнай лініі Г. Х. Андэрсана. Творы А. Масла для дзяцей – гэта прыклад сучаснай аўтарскай казкі з двума ўзроўнямі прачытання: для дарослых і дзяцей. У казках гэтага аўтара заўважаюцца выкарыстанне хрысціянскіх матываў, часта нешчаслівы

фінал, што набліжае творы да казак Г. Х. Андэрсана, надае ім жанравыя адзнакі прыпавесці.

У падраздзеле 2.3 **“Прырода мастацкага вымыслу ў літаратурнай чарадзейнай казцы (на прыкладзе твораў А. Бадака)”** аналізуецца спецыфічны вымысел казкі, які ўплывае на пасторава-часавы кантынуум твора, характарыстыку і паводзіны герояў, стварае эфекты, якія дапамагаюць зразумець з’явы, што адбываюцца ў рэальным, нечарадзейным свеце. Вымысел чарадзейнай літаратурнай казкі можа быць ахарактарызаваны як узаемадзеянне двух відаў умоўнасцей: першаснай (рэалістычнай) і другаснай (казачнай). У казках А. Бадака можна заўважыць наступныя мастацкія эфекты, якія дасягаюцца дзякуючы выкарыстанню казачнага вымыслу: эфект незвычайнасці, які стымулюе творчы пачатак чытача, робячы яго ўдзельнікам стварэння мадэлі рэальнасці; эфект акумуляцыі сэнсу адлюстраванага, што дазваляе ўбачыць сутнасць феноменаў навакольнага свету і сфарміраваць мастацкую перспектыву; эфект рэалізацыі абстракцый, які дае магчымасць прадстаўляць вельмі складаныя філасофскія праблемы ў канкрэтным мастацкім абліччы; эфект рэтраспекцыі, які забяспечвае суаднясенне адлюстраванага з вечнымі, архетыпічнымі вобразамі і ўяўленнямі.

У падраздзеле 2.4 **“Канцэпцыя патрыятычнага выхавання ў казках А. Карлюкевіча”** даследуюцца шматлікія творы А. Карлюкевіча. Яны з’яўляюцца ўзорам дзіцячай кнігі, якая можа адначасова быць і займальнай, і выконваць складаную функцыю патрыятычнага выхавання. Патрыятычнае ў казках аўтара вызначаецца праз пазнавальны кампанент (у творах шмат краязнаўчай інфармацыі, прысутнічаюць рэгіянальныя тапонімы і гідронімы, а таксама гісторыі, звязаныя з імі).

У трэцім раздзеле “**Тэндэнцыі развіцця сучаснай падлеткавай прозы”** прааналізавана паняцце “падлеткавая літаратура”, даследаваны гісторыя яе з’яўлення, чытацкія прыярытэты сучасных падлеткаў-школьнікаў, вызначана жанрава-тэматычная спецыфіка падлеткавых твораў, вывучаны вобразы падлеткаў і дарослых у прозе для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту.

У падраздзеле 3.1 **“Змест паняцця «падлеткавая літаратура»”** шырока даследавана паняцце “падлеткавая літаратура”. У канцы 1950-х гадоў падлеткавая літаратура сфарміравалася як жанр, для якога быў характэрны герой-падлетак, што знаходзіцца ў пошуку і вырашае для сябе спектр важных этычных праблем. З цягам часу яе змест пашыраецца, з’яўляюцца свае паджанры ўнутры дадзенай катэгорыі. З кагнітыўнага боку для літаратуры, адрасаванай падлеткам, характэрныя наступныя асаблівасці сюжэту: праблемны характар, зварот да адносін з прадстаўніком супрацьлеглага полу, наяўнасць атрыбутыкі сучаснага падлеткавага жыцця. Звычайна падлеткавыя

творы пазбаўлены дэкларатыўнай ацэначнасці і павучальнасці, увага скіравана на перажыванні галоўнага героя і яго адносіны, часта канфліктныя, з грамадствам. Узростам героя вызначаецца ўзрост чытацкай аўдыторыі кніг.

У падраздзеле 3.2 **“Чытацкія прыярытэты сучасных падлеткаў”** аналізуюцца вынікі сацыялагічнага даследавання. Па выніках праведзенага апытання высветлілася, што сучасным падлеткам блізкія традыцыйныя для такога ўзросту жанры: фэнтэзі (24%), прыгоды (23%), рамантычныя гісторыі (25%), фантастыка (16%), дэтэктывы (12%). Юныя беларускія чытачы не выявілі ў ходзе апытання цікавасці да праблем наркотыкаў і гвалту ў літаратуры. Гэтыя вынікі пацвярджаюць, што падлеткавая літаратура не павінна мець просталінейнага агітацыйна-прапагандысцкага характару: яе ідэйна-маральная скіраванасць больш эфектыўна рэалізуецца як імпліцытная. У задачы пісьменніка ўваходзіць уменне навучыць дзіця, школьніка разбірацца ў той ці іншай праблеме, даць чытачу магчымасць прыйсці да ўсвядомленага выбару ў рэальным жыцці пры вырашэнні адпаведнай праблемнай сітуацыі.

У падраздзеле 3.3 **“Жанрава-тэматычныя адметнасці сучаснай падлеткавай прозы”** аўтар вызначае наступныя жанравыя прыярытэты ў практыцы беларускіх пісьменнікаў: твор-актуалізацыя гістарычнага мінулага, дзе найбольш вылучаецца хронафантастыка, увага ў такіх творах акцэнтуецца не на спосаб перамяшчэння ў часе, а на маральныя пераўтварэнні герояў *(Р. Баравікова, А. Наварыч, Я. Пастарнак і А. Жвалеўскі, Л. Рублеўская, К. Хадасевіч-Лісавая)*; падлеткавыя дэтэктывы *(А. Федарэнка);* творы з актуальнай для падлетка праблематыкай, асноўнымі тэмамі якіх з’яўляюцца ўзаемаадносіны з супрацьлеглым полам, сяброўства і адносіны да бацькоў *(В. Гапееў, А. Бадак, Л. Дрожжа, А. Масла, Я. Пастарнак і А. Жвалеўскі).* Найбольш удала раскрываюць тэму падлеткавага жыцця так званыя праблемныя творы, якія ілюструюць канфлікт падлетка з акаляючым асяроддзем, першы вопыт дарослага жыцця.

У падраздзеле 3.4 **“Памежны вобраз настаўніка ў падлеткавых аповесцях В. Гапеева”** разглядаецца паняцце памежнасці вобраза настаўніка на прыкладзе вобразаў педагогаў у творах В. Гапеева. Можна вылучыць наступныя “межы”, звязаныя з вобразам сучаснага настаўніка. Межы прафесійнага плану: *настаўнік-прадметнік, настаўнік-выхавальнік, настаўнік-адміністратар.* Межы камунікатыўнага плану: *настаўнік-вучань, настаўнік-калектыў, настаўнік-прадстаўнік супрацьлеглага полу.* Мяжа *настаўнік-вучань* дэманструе перавагу таго ці іншага стылю зносін з навучэнцамі (дэмакратычнага ці аўтарытарнага). Аналіз паняцця памежнасці настаўніка ў падлеткавых аповесцях В. Гапеева дазваляе вызначыць, што гендарная прыналежнасць настаўніка, яго прафесійны статус, рысы характару, знешнасць

моцна ўплываюць на стаўленне да яго вучняў, а таксама на характар усёй камунікацыі дзіцяці ў школе. Такая праблематыка вылучае прозу В. Гапеева ў плыні беларускай літаратуры для дзяцей.

У падраздзеле 3.5 “**Вобразы бацькоў у сучасных падлеткавых творах**” разгледжаны вобразы дарослых у творах праблемнага характару *(А. Масла, В. Гапееў, Я. Пастарнак і А. Жвалеўскі).* Паколькі адзін з самых прыкметных канфліктаў у падлеткавай літаратуры – гэта канфлікт бацькоў і дзяцей, то відавочна, што ў творах нароўні з мадэллю сям’і ў цэлым падлягаюць пераасэнсаванню і ўстойлівыя ролі кожнага з яе членаў. Аналіз твораў названых аўтараў дазваляе зрабіць вывад пра ўскладненне вобраза дарослага, яго меншай ідэалізацыі. Бацькі нярэдка паказаны як інфантыльныя, засяроджаныя на сваіх пачуццях, а падлетак становіцца больш аўтаномным, здольным жыць сам па сабе, часам яму даводзіцца вырашаць праблемы бацькоў. Аднак менавіта такое пазіцыяванне персанажаў дае аўтару больш свабоды ў абмалёўцы дзеянняў герояў-падлеткаў, іх выбару, сталення.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. У выніку падсумавальнага аналізу фармуліровак паняцця “дзіцячая літаратура” вызначаны наступныя адметнасці функцыявання мастацкіх тэкстаў, адрасаваных дзецям: пастулюецца, што дзіцячая літаратура развіваецца такім жа чынам, што і дарослая (этапы развіцця, стылі, напрамкі); мае аптымістычны і забаўляльны характар, што робіць яе падобнай да масавай літаратуры; з’яўляецца сродкам педагагічнага выхавання. Агляд класіфікацый дзіцячай літаратуры дазваляе вылучыць тры найбольш апрабіраваныя навукоўцамі варыянты: функцыянальная класіфікацыя, узроставая, жанравая. Усе тры варыянты класіфікацыі лагічна суадносяцца паміж сабой, бо дзіцячая літаратура для кожнай узроставай катэгорыі ўтрымлівае пэўныя жанры і выконвае адпаведныя педагагічныя задачы. Дзіцячая літаратура характарызуецца выразнай спецыфічнасцю, бо знаходзіцца на мяжы ўласна літаратуры і педагогікі, літаратуры і псіхалогіі. Прапорцыя забаўляльнага і выхаваўчага элементаў у такой літаратуры абумоўлена наяўнасцю дзвюх катэгорый чытачоў: свядомага дарослага і наіўнага дзіцяці. Дваісты статус дзіцячай літаратуры абумоўлівае з’яўленне розных відаў яе крытыкі (аналіз мастацкасці твора і аналіз яго педагагічнай цэласнасці), крытэрыяў ацэнкі (згодна з жанравымі асаблівасцямі твораў і згодна з узроставымі магчымасцямі чытача).

Праведзенае аўтарам дысертацыі сацыялагічнае даследаванне чытацкіх інтарэсаў дзяцей і падлеткаў у выбары кніг, прыярытэтаў бацькоў дашкольнікаў, сувязей інтарэсаў чытацкай аўдыторыі з новай літаратурай для дзяцей, створанай у Рэспубліцы Беларусь, пацвердзіла адпаведнасць гэтага віду творчасці агульным тэндэнцыям да змены культурнай парадыгмы на постсавецкай прасторы [1; 4; 10; 14; 20; 27; 30; 32].

2. Сучасны чалавек, у тым ліку – дзіця, падлеглы ўплывам тэндэнцыі да развіцця кліпавага мыслення. Яно фарміруецца ў сувязі з экспансіяй масавай культуры, што актыўна распаўсюджваецца ва ўсім свеце з сярэдзіны XX ст. У сучасных кнігах для дашкольнікаў шырока прадстаўлены займальныя ілюстрацыйна-інтэрактыўныя і тэкставыя элементы: пазлы, маляванкі, матэрыял для аплікацыі, рэцэпты, песні. Аўтары сучаснай беларускай прозы для дзяцей імкнуцца выкарыстоўваць названыя элементы не толькі для стымуляцыі хуткасці і вобразнасці дзіцячага мыслення, але ў першую чаргу для забеспячэння развіццёвай работы над спасціжэннем ідэі твора, расстаноўкі акцэнтаў на эпізодах, якія маюць выхаваўча-пазнавальнае значэнне. Аналіз меркаванняў бацькоў і дзяцей адносна кніг, прызначаных для дашкольнага ўзросту, дазваляе зрабіць вывад пра існуючыя ў Рэспубліцы Беларусь патрабаванні да такіх твораў: павага да ментальных і гісторыка-культурных традыцый, з якой вынікае пэўны кансерватызм; пры максімальнай ілюстраванасці кнігі – гарманічнае спалучэнне зместу і афармлення; адназначнасць пафасу ў размежаванні дабра і зла, выразнасць і адназначнасць сюжэтных ліній. Сярод жанраў кніг, прадстаўленых ва ўзроставай катэгорыі дашкольнікаў, вылучаюцца: навучальная кніга-карцінка (*У. Бубен, В. Богдан*), казкі пазнавальнага характару з гульнёвым элементам (*В. Астахновіч, Т. Сівец, Г. Скаржынская-Савіцкая*), казкі-прыгоды жывёлы ці адушаўлёнага прадмета (*Г. Каржанеўская, Л. Рублейская, Н. Бучынская, В. Богдан*). У дадзеных кнігах адзначаецца перавага пазнавальнага аспекта над выхаваўчым, спалучэнне вербальнага і невербальнага кампанентаў, наяўнасць інтэрактыўнасці, гульнёвых элементаў [5; 13; 18; 19; 29].

3. У цэнтры большасці кніг для малодшых школьнікаў – асоба дзіцяці, прызнанне яе індывідуальнасці. Разам з тым кнігі для малодшага школьнага ўзросту не заўсёды адпавядаюць інтарэсам сучасных школьнікаў, бо дарослыя недаацэньваюць іх чытацкія здольнасці і інфармацыйную дасведчанасць. Аналіз анкетавання бацькоў і дзяцей на дадзеную тэму пацвердзіў гэтую гіпотэзу, бо прапанаваныя бацькамі папулярныя тэмы для твораў не супадалі з тэмамі, прапанаванымі дзецьмі. Сярод твораў, прызначаных для малодшых школьнікаў, вылучаюцца наступныя жанры: рэалістычныя апавяданні з персанажамі-дзецьмі (*Т. Мушынская, В. Гурскі, А. Зэкаў, В. Ткачоў* і інш.),

казкі пазнавальнага характару (*Р. Баравікова, Л. Рублеўская, В. Шчукіна, А. Марціновіч, А. Бутэвіч* і інш.), казкі-падарожжы з героямі-равеснікамі (*В. Гапееў, А. Масла, У. Васькоў, К. Хадасевіч-Лісавая, Г. Аўласенка, А. Карлюкевіч* і інш.). Кнігі для малодшых школьнікаў найбольш шырока прадстаўлены на кніжным рынку Беларусі, аднак суадносіны рэалістычнай і казачнай прозы складваюцца на карысць другой. Апавядальнік-наратар у тэкставай структуры дадзеных кніг з’яўляецца больш выражаным у параўнанні з яго месцам у творах для дашкольнікаў, бо сам школьнік становіцца чытачом, апавядальнік дапамагае спасцігнуць ідэю твора без удзелу дарослых. Нягледзячы на разнастайнасць тэм, выяўлена жаданне беларускіх аўтараў пазбегнуць небяспечных для дзіцячай псіхікі праблем, што, з аднаго боку, ёсць праява сучаснай тэндэнцыі да максімальнай аховы ўнутранага свету чытача, а з другога боку, у гэтым адлюстраваны пэўны разрыў паміж зместам дзіцячай кнігі і тымі ведамі, якія атрымлівае дзіця з іншых сродкаў інфармацыі. Героі-дзеці ў творах для малодшых школьнікаў дзейнічаюць больш самастойна, адкрыта выяўляюць свае эмоцыі. Героі-дарослыя часта выступаюць у ролі ініцыятараў цікавых заняткаў ці аўтараў творчых, часта неверагодных тлумачэнняў тых ці іншых з’яў [5; 20; 25; 36].

4. Сучасная беларуская літаратурная казка мае падобныя рысы з іншымі літаратурнымі жанрамі, найперш такімі, як фэнтэзі і фальклорная казка. Народная і літаратурная казкі маюць шэраг адрозненняў па наступных параметрах: метад адлюстравання рэчаіснасці, хранатоп, памеры, выхаваўча-педагагічная ідэя, форма наратыву, інтэртэкстуальныя сувязі. Выразнай адметнасцю літаратурнай казкі ў параўнанні з фэнтэзі і народнай казкай з’яўляюцца прынцып стварэння казачнай умоўнасці і рэалізацыя педагагічна-эстэтычнай функцыі. Сучасная літаратурная казка адрозніваецца наступнымі асаблівасцямі: зваротам да праблем сям’і; адлюстраваннем уплываў камп’ютарызацыі; мадэрнізуюцца вобразы галоўных герояў і другасных персанажаў, вобразаў-рэчаў. Казка становіцца адным са сродкаў усведамлення этнакультурнай ідэнтычнасці дзіцяці (*А. Карлюкевіч, А. Масла, Л. Рублеўская*) [3; 5; 10; 11; 17; 21; 22; 26; 28; 31; 33].

5. Даследаванне сучаснай падлеткавай літаратуры патрабуе аналізу спектра прыярытэтных каштоўнасцей сучаснага падлетка, спецыфікі стварэння вобраза героя, жанрава-тэматычных асаблівасцей твораў тых аўтараў, якія пішуць для школьнікаў старэйшага ўзросту: *В. Гапеева, А. Бадака, Л. Рублеўскай, А. Наварыча, А. Федарэнкі, Л. Дрожжа, А. Масла, Я. Пастарнак і А. Жвалеўскага, К. Хадасевіч-Лісавой.* Для падлеткавай літаратуры характэрныя наступныя асаблівасці сюжэту: праблемны характар, зварот да адносін з прадстаўніком супрацьлеглала полу, наяўнасць атрыбутыкі

сучаснага падлеткавага жыцця. У сучаснай прозе для падлеткаў мяняецца вобраз значнага дарослага: ён  можа быць больш інфантыльным, засяроджаным на сваіх пачуццях, што прыводзіць да аўтаномнасці героя-падлетка. Найбольш удала раскрываюць тэму падлеткавага жыцця творы, якія ілюструюць канфлікт падлетка з акаляючым асяроддзем, першы вопыт дарослага жыцця.

У цэлым, у канцэптуальным плане найбольш значнымі і сфарміраванымі тэндэнцыямі ў развіцці сучаснай беларускай прозы для дзяцей дашкольнага і школьнага (малодшага, сярэдняга, падлеткавага) узростаў з’яўляюцца наступныя:

– тэндэнцыя да адлюстравання змены культурнай парадыгмы ў беларускім грамадстве постсавецкага часу (мадэрнізацыя тэм, жанраў, сюжэтаў, персанажаў);

– да кампенсацыі развіцця кліпавага мыслення ў сучасных дзяцей і падлеткаў (праз стварэнне тэкстаў, багатых не толькі вербальна і невербальна, але і сэнсава, эстэтычна);

– да балансу ў імкненнях, з аднаго боку, ахоўваць псіхіку дзіцяці і падлетка ад негатыўных праяў жыцця, і, з другога боку, неабходнасці раскрываць прычыны тых разбуральных сітуацый, з якімі сутыкаецца дзіця і падлетак у любым сучасным соцыуме [2; 6; 7; 8; 12; 16; 23; 24; 35].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

1. Асноўныя палажэнні дысертацыі будуць запатрабаваныя пры далейшым даследаванні дзіцячай літаратуры ў айчынным літаратуразнаўстве, пры даследаванні тэорыі рэдактарскай ацэнкі твораў для дзяцей, пры стварэнні навучальных дапаможнікаў па дзіцячай літаратуры, у адукацыйнай практыцы.

2. Вынікі дысертацыйнага даследавання атрымалі шырокае ўкараненне ў вучэбным працэсе на аддзяленнях “Пачатковая адукацыя”, “Дашкольная адукацыя” Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа імя Л. С. Выгоцкага ў ходзе выкладання курсаў “Беларуская літаратура”, “Беларуская дзіцячая літаратура”. На аснове даследавання створана эксперыментальная лабараторыя “Экспертыза дзіцячай кнігі”, удзельнікамі якой з’яўляюцца навучэнцы каледжа. Такім чынам, вынікі даследавання могуць быць выкарастаны ў прафесійным навучанні выхавацелей, настаўнікаў пачатковых класаў, выкладчыкаў беларускай літаратуры.

3. Дысертацыйныя напрацоўкі могуць быць карыснымі для работы бібліятэк, складанні вучэбных праграм па беларускай літаратуры.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА НАВУКОВАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях

1. Пятроўская, Т. М. Адлюстраванне гендарных стэрэатыпаў у сучаснай дзіцячай літаратуры / Т. М. Пятроўская // Роднае слова. – 2015. – № 12. – С. 19–22.

2. Пятроўская, Т. М. Асноўныя тэндэнцыі ў сучаснай падлеткавай прозе / Т. М. Пятроўская // Роднае слова. – 2016. – № 11. – С. 23–26.

3. Пятроўская, Т. М. Анатомія дзвюх казак, ці Прырода мастацкага вымыслу казак А. Бадака / Т. М. Пятроўская // Полымя. – 2017. – № 11. – С. 34–137.

4. Пятроўская, Т. М. Пакаленню гаджэтаў – пра вайну мастацкім словам / Т. М. Пятроўская // Роднае слова. – 2018. – № 5. – С. 54–56.

5. Пятроўская, Т. Канцэпцыя патрыятычнага выхавання ў казках А. Карлюкевіча / Т. Пятроўская // Известия Гомельского государственного университета университета имени Ф. Скорины, Гуманитарные науки, 2018. – № 4 (109) – С. 138–142.

6. Пятроўская, Т. Памежны вобраз настаўніка ў падлеткавых аповесцях В. Гапеева / Т. Пятроўская // Роднае слова, 2019. – № 10. – С. 20–23.

7. Пятроўская, Т. Падлеткавая проза ад класіка, ці пра што марылі юнакі пакалення Івана Навуменкі / Т. Пятроўская // Роднае слова, 2020. – № 2. – С. 35–37.

8. Пятроўская, Т. Вобразы бацькоў у сучасных падлеткавых творах / Т. Пятроўская // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины, Гуманитарные науки, 2020. – № 1 (118) – С. 118–122.

### Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках

9. Пятроўская, Т. Гуманістычная накіраванасць сучаснай беларускай дзіцячай паэзіі / Т. Пятроўская // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. нав. артыкулаў / рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (гал. рэд) [і інш.], М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – С. 95–100.

10. Пятроўская, Т. Суадносіны народнай і сучаснай літаратурнай казак / Т. Пятроўская // Скарынаўскія традыцыі: гісторыя і сучаснасць : зборнік навуковых артыкулаў / рэдкал. : А. М. Ермакова (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва

адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. – С. 225–229.

11. Пятроўская, Т. Наратыўныя стратэгіі сучаснай літаратурнай казкі / Т. Пятроўская // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре : сборник научных статей.: вып. 10 / редкол.: Т. Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – С. 65–67.

12. Петровская, Т. М. Биология+литература, или Отражение темы взаимоотношений между мужчиной и женщиной в белорусской литературе для подростков / Т. М. Петровская // Нёман. – 2018. – № 4. – С.174–178.

13. Пятроўская, Т. Развіццё інтарэсу дзяцей дашкольнага ўзросту да сучаснай мастацкай літаратуры сродкамі супрацоўніцтва бацькоў і ўстановы адукацыі / Т. Пятроўская // Пралеска, 2019. – № 5. – С. 7–11.

14. Пятроўская, Т. М. Статус перакладной і рускамоўнай беларускай літаратуры для дзяцей / Т. М. Пятроўская // Аксиологический диапазон художественной литературы : сборник научных статей / Витебский государственный университет ; под науч. ред. В. Ю. Боровко, Е. В. Крикливец. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2020. – С. 199–202.

15. Пятроўская, Т. Нацыянальная ідэнтыфікацыя падлеткавых аповесцей Я. Пастэрнак і А. Жвалеўскага / Т. Пятроўская // Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі : зб. навук. артыкулаў па выніках Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 15–16 лістапада 2018 г. – Мінск : МДЛУ, 2021. – 220 с. – С. 193–202.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

16. Пятроўская, Т. Проза Івана Навуменкі для юнацтва як сродак ідэйна-маральнага выхавання сучаснай моладзі / Т. Пятроўская // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : матэрыялы Міжнародных навуковых чытанняў, Гомель, 25–26 верасня 2014 г. / рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (адказны рэдактар) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – С. 123–126.

17. Пятроўская, Т. Асаблівасці наратыву ў сучаснай літаратурнай казцы / Т. Пятроўская // Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры : матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 26–27 лютага 2015 г. / рэдкал.: А. А. Манкевіч (укладальнік) [і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 2015. – С. 101–104.

18. Пятроўская, Т. Кнігі-карцінкі як сучасны фармат кніг для дашкольнікаў / Т. Пятроўская // От идеи – к инновации : материалы XXII Республиканской студенческой научно-практической конференции, Мозырь, 23 апреля 2015 г. / редкол.: И. Н. Кралевич (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь : МГПУ имени И. П. Шамякина, 2015. – С. 100–101.

19. Пятроўская, Т. Выкарыстанне праектнай дзейнасці ў працэсе выкладання беларускай дзіцячай літаратуры навучэнцам педагагічных каледжаў / Т. Пятроўская // Дзіцячы сад – пачатковая школа: вопыт, праблемы пераемнасці і аптымізацыі адукацыі : матэрыялы IX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мазыр, 29 кастрычніка 2015 г. / рэдкал.: Б. А. Крук (адказны рэдактар) [і інш.]. – Мазыр : МДПУ, 2015. – С. 142–144.

20. Пятроўская, Т. Асаблівасці адлюстравання гендарных стэрэатыпаў у сучаснай дзіцячай літаратуры / Т. Пятроўская // Юбилейная научно-практическая конференция, посвященная 85-летию Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины, Гомель, 17 июня 2015 г. : материалы / редкол.: О. М. Демиденко (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – С. 203–205.

21. Пятроўская, Т. Сучасная літаратурная казка як сродак развіцця этнакультурнай ідэнтычнасці дзіцяці / Т. Пятроўская // Актуальные вопросы непрерывного педагогического образования [Электронный ресурс] : материалы Республиканской научно-практической конференции с международным участием, посвященной 75-летию Гомельского областного института развития образования, Гомель, 17–18 ноября 2016 г. / государственное учреждение образования “Гомельский областной институт развития образования” ; редкол.: А. З. Бежанишвили (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГОИРО, 2016. (1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – С. 242–246.

22. Пятроўская, Т. Асаблівасці сучаснай літаратурнай казкі / Т. Пятроўская // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : матэрыялы Міжнародных навуковых чытанняў, Гомель, 6–7 кастрычніка 2016 г. / рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (адказны рэдактар) і [інш.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – С. 56–59.

23. Пятроўская, Т. Тэндэнцыі развіцця сучаснай падлеткавай прозы / Т. Пятроўская // Актуальные проблемы филологических и педагогических наук, посвященные исследованиям в области лингвистики, литературоведения (белорусский, русский, английский, немецкий, французский языки); методики преподавания иностранных языков, белорусского, русского языка и литературы : материалы докладов II Республиканской студенческой научно-практической конференции с международным участием, Барановичи,

23 ноября, 2016 года / редкол.: А. В. Никишова (главный редактор) [и др.]. – Барановичи : БарГУ, 2017. – С. 40–42.

24. Пятроўская, Т. Месца падлеткавай літаратуры ў сучасным літаратурным працэсе / Т. Пятроўская // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : зб. матэрыялаў Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, 25 лютага 2016 г. / рэдкал.: З. П. Мельнікава, І. А. Швед, А. С. Кавалюк, Г. М. Ішчанка, С. М. Шчэрба, У. А. Сенькавец ; пад агул. рэд. У. А. Сенькаўца ; Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2017. – С. 95–99.

25. Пятроўская, Т. Развіццё этнакультурнай ідэнтычнасці дзяцей праз літаратуру / Т. Пятроўская // Актуальные проблемы методики начального обучения и эстетического воспитания учащихся: материалы IV Республиканской научно-практической конференции, 30 марта 2017 г., г. Могилёв, Могилёвский государственный университет имени А. А. Кулешова / под ред. С. П. Чумаковой, А. А. Папейко. – Могилёв : МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 254–257.

26. Пятроўская, Т. Жанравыя асаблівасці казак Алены Масла / Т. Пятроўская // Содружество наук. Барановичи – 2017 : материалы XIII Международной научно-практической конференции молодых исследователей, Барановичи, 18–19 мая 2017 г. / редкол.: В. В. Климук (главный редактор) [и др.]. – Барановичи : БарГУ, 2017. – С. 73–76.

27. Пятроўская, Т. Адлюстраванне субкультуры дзяцінства пачатку дваццатага стагоддзя ў чытанцы Якуба Коласа "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" / Т. Пятроўская // Гісторыя беларускай літаратуры : стан і перспектывы даследавання (да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа) : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 15–16 лістапада 2017 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – С. 86–89.

28. Пятроўская, Т. Жанравыя асаблівасці сучаснай казачнай аповесці на прыкладзе твораў А. Масла / Т. Пятроўская // матэрыялы V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мазыр, 29 верасня 2017 г. / УА МДПУ імя І. П. Шамякіна ; рэдкал.: А. У. Сузько (адк. рэд.). – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2017. – С. 98–101.

29. Пятроўская, Т. Лабараторыя "Экспертыза дзіцячай кнігі" як актуальная форма работы пры падрыхтоўцы сучаснага педагога / Т. Пятроўская // Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: практико-ориентированная и фундаментальная подготовка на первой и второй ступенях высшего образования [Электронный ресурс] : материалы

Республиканской научно-методической конференции, Гомель, 15–16 марта 2018 г. / государственное учреждение образования “Гомельский областной институт развития образования” ; редкол.: А. З. Бежанишвили (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГОИРО, 2018. – С. 355–388.

30. Пятроўская, Т. Сучасныя аспекты даследавання дзіцячай літаратуры / Т. Пятроўская // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Магілёў, 19 красавіка 2018 г. / пад рэд. С. Э. Сомава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – С.139–142.

31. Петровская, Т. Христианский гуманизм современной белорусской сказки как средство формирования этнокультурной идентичности / Т. Петровская // Христианские ценности в культуре современной молодежи : сборник докладов VII Международной конференции студентов, магистрантов и аспирантов, 26 октября 2018 г. / редакторы-составители: С. И. Шатравский, С. А. Юшкевич; оформление: Г. А. Липкович. – Минск : Изд. центр БГУ, 2018. – С. 121–124.

32. Пятроўская, Т. Канцэпцыі даследавання сучаснай дзіцячай літаратуры / Т. Пятроўская // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : матэрыялы Міжнародных навуковых чытанняў, Гомель, 2–3 кастрычніка 2018 г. / рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (адказны рэдактар) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – С. 152–154.

33. Пятроўская, Т. Характары дзяцей у сучасных літаратурных казках / Т. Пятроўская // Актуальные проблемы филологических и педагогических наук : материалы докладов IV Республиканской студенческой научно-практической конференции, Барановичи, 21 ноября 2018 года / под ред. В. В. Клімук. – Барановичи : БарГУ, 2019. – С. 87–91.

34. Пятроўская, Т. Уплыў камп‘ютарызацыі на змест сучасных казак / Т. Пятроўская // Global science and innovations 2019: Central Asia : материалы V Международной научно-практической конференции, VIII том, Астана, 17 марта 2018 г. / редкол.: Е. Ешим (главный редактор) [и др.]. – Астана : “Общенациональное движение Бобек”, 2019. – С. 366–369.

35. Пятроўская, Т. Мадэль значнага дарослага ў сучасных падлеткавых творах / Т. Пятроўская // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Магілёў, 19 красавіка 2019 г. / пад рэд. С. Э. Сомава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2019. – С.139–142.

36. Петровская, Т. Христианские мотивы в белорусской детской литературе / Т. Петровская // Наследие святых Кирилла и Мефодия в мировой духовной культуре : сборник докладов Юбилейных XXV международных Кирилло-Мефодиевских чтений, Минск, 31 мая 2019 г. / ГУО “Институт

теологии имени святых Мефодия и Кирилла” Белорусского государственного университета: С. И. Шатравский, священник Святослав Рогальский. – Минск : Христианский образовательный центр имени святых Мефодия и Кирилла, 2020. – С. 298–302.

## РЭЗЮМЭ

Пятроўскай Таццяны Міхайлаўны

## БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ПРОЗА ПАЧАТКУ XXI СТ.: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

**Ключавыя словы:** беларуская дзіцячая літаратура, літаратурная казка, падлеткавая літаратура, літаратура для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, літаратура для дзяцей дашкольнага ўзросту, чытач, жанр, тэматыка, галоўны герой.

**Мэта даследавання** – выяўленне асаблівасцей беларускай дзіцячай прозы на сучасным этапе яе развіцця шляхам сістэмна-комплекснага аналізу твораў і попыту адпаведнай чытацкай аўдыторыі.

**Метады даследавання.** Метадалогія даследавання носіць комплексны характар. Улічваецца структурна-семіятычны падыход, прымяняюцца метад кантэкстуальнага аналізу мастацкага тэксту, параўнальна-супастаўляльны метад.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У рабоце *ўпершыню* комплексна вызначаны вядучыя тэндэнцыі ў зменах ідэйна-эстэтычнага зместу празаічнага твора, адрасаванага дзецям; вылучаны наратыўныя і кагнітыўна-эмацыянальныя аспекты сюжэтаў і сістэм персанажаў у беларускай прозе 2001 – 2010-х гг. для дзяцей. Выяўлены судносіны рэалістычнага і фантастычнага пачаткаў, уласцівых сучаснай дзіцячай літаратуры, раскрыта і сцверджана спецыфіка псіхалагічнага аналізу ў ёй. Выяўлены жанравыя адметнасці твораў 2001 – 2010-х гг. для чытацкай аўдыторыі адрозных узроставых катэгорый (літаратура для дашкольнікаў, літаратура для школьнікаў малодшага школьнага ўзросту, літаратура для школьнікаў старэйшага школьнага ўзросту), экспансія жанру літаратурнай казкі. Створана цэласная характарыстыка тых ідэйна-эстэтычных праяў у беларускай прозе для дзяцей, што абумоўлены тэндэнцыяй да змены культурнай і выхаваўчай парадыгмы ў грамадстве.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыі будуць запатрабаваныя пры далейшым даследаванні дзіцячай літаратуры ў айчынным літаратуразнаўстве, пры даследаванні тэорыі рэдактарскай ацэнкі твораў для дзяцей.

**Сфера прымянення:** літаратуразнаўства, методыка выкладання літаратуры, псіхалогія, педагогіка, сацыялогія.

## РЕЗЮМЕ

Петровской Татьяны Михайловны

## БЕЛОРУССКАЯ ДЕТСКАЯ ПРОЗА НАЧАЛА XXI ВЕКА: ОСНОВНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ

**Ключевые слова:** белорусская детская литература, литературная сказка, подростковая литература, литература для детей младшего школьного возраста, литература для дошкольников, читатель, жанр, тематика, главный герой.

**Цель исследования** – выявление особенностей белорусской детской прозы на современном этапе ее развития путем системного анализа произведений и востребованности соответствующей читательской аудитории.

**Методы исследования.** Методология исследования носит комплексный характер. Учитывается структурно-семиотический подход, применяется метод контекстуального анализа художественного текста, сравнительно-сопоставительный метод.

**Полученные результаты и их новизна.** В работе *впервые* комплексно определяются ведущие тенденции изменения идейно-эстетического содержания прозаического произведения, адресованного детям; освещаются повествовательные и когнитивно-эмоциональные аспекты сюжетов и систем персонажей в белорусской прозе 2001 – 2010 гг. для детей. Обозначены признаки реалистическо-фантастического начала, характерные для современной детской литературы, выявляются и подтверждаются особенности психологического анализа в ней. Выявлены жанровые особенности произведений 2001 – 2010 гг. для читателей разных возрастных категорий (литература для дошкольников, литература для младших школьников, литература для старшеклассников), расширение жанра литературной сказки. Создано комплексное описание тех идейно-эстетических проявлений в белорусской детской прозе, которые вызваны тенденцией смены культурно-образовательной парадигмы в обществе.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Основные положения диссертации могут быть востребованы при дальнейшем изучении детской литературы в отечественном литературоведении, при изучении теории редакционной оценки произведений для детей.

**Область применения:** литературоведение, методика преподавания литературы, психология, педагогика, социология.

**SUMMARY**

Petrovskaya Tatyana Mikhailovna

**BELARUSIAN CHILDREN'S PROSE OF THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY: MAIN DEVELOPMENT TRENDS**

**Key words:** Belarusian children's literature, literary fairy tale, teenage literature, literature for children of primary school age, literature for preschoolers, reader, genre, themes, protagonist.

**The purpose of the study** is to identify the features of Belarusian children's prose at the present stage of its development through a systematic analysis of works and the relevance of the corresponding readership.

**Research methods.** The research methodology is complex. The structural-semiotic approach is taken into account, the method of contextual analysis of the literary text, the comparative method is applied.

**The results obtained and their novelty.** The work *for the first time* comprehensively defines the leading trends in the change in the ideological and aesthetic content of a prose work addressed to children; the narrative and cognitive-emotional aspects of plots and systems of characters in the Belarusian prose of 2001 –2010 for kids. The signs of a realistic-fantastic beginning, characteristic of modern children's literature the features of psychological analysis in it are identified and confirmed. The genre features of the works of 2001 – 2010 for readers of different age categories (literature for preschoolers, literature for junior schoolchildren, literature for high school students), the expansion of the literary fairy tale genre are revealed. A comprehensive description of those ideological and aesthetic manifestations in Belarusian children's prose, which are caused by the tendency to change the cultural and educational paradigm in society has been created.

**Recommendations on the use of the obtained results.** The main provisions of the dissertation can be in demand in the further study of children's literature in domestic literary criticism, in the study of the theory of editorial evaluation of works for children.

**Scope:** literary criticism, methods of teaching literature, psychology, pedagogy, sociology.

Навуковае выданне

**ПЯТРОЎСКАЯ**
ТАЦЦЯНА МІХАЙЛАЎНА

**БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ПРОЗА ПАЧАТКУ XXI СТ.:
АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ**

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Падпісана да друку 15.08.2022. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. др. арк. 1,63.
Улік.-выд. арк. 1,78. Тыраж 60 экз. Заказ 379.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 3/1452 ад 17.04.2017.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246028, Гомель.